■ Падзяліцца ведамі

ВЯЧЭРНЯЯ ШКОЛА ДЛЯ «ПІЯРШЧЫКАЎ»

Новы сезон адкрыла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце «Акадэмія камунікацыі: PR і рэклама».

Гэты адукацыйны праект распрацавалі летась студэнты спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» Інстытута журналістыкі БДУ для папулярызацыі прафесійных ведаў па сувязях з грамадскасцю і рэкламе. «Акадэмія» ўяўляе сабой бясплатныя спецыялізаваныя курсы, слухачамі якіх можа стаць кожны, хто цікавіцца названымі сферамі дзейнасці. Пры гэтым ніякіх абмежаванняў па ўзросце ці прафесійных перавагах няма.

Праца акадэміі будзе арганізавана ў рамках дзвюх тэматычных галерэй — рэкламнай і PR. Вучоба пройдзе ў фармаце «роўны навучае роўнага». У ролі «педагогаў» выступяць студэнты Інстытута журналістыкі, якія падзеляцца назапашанымі ведамі, а таксама падрыхтуюць для слухачоў майстар-класы беларускіх экспертаў у сферы рэкламы і сувязяў з грамадскасцю.

Сустрэчы будуць праходзіць у адзін і той жа вячэрні час па серадах з лістапада па сакавік. А завершыцца адукацыйны сезон удзелам у IX міжнародным адкрытым студэнцкім камунікацыйным форуме «PR-кветка—2016», які адбудзецца ў канцы сакавіка ў Інстытуце журналістыкі БДУ.

Арганізатарам мерапрыемства выступіла кафедра тэхналогій камунікацыі Інстытута журналістыкі БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

А ДУША — У ЗАМОШШЫ

Сустрэчы з паэтам Уладзімірам Андрэевічам Паўлавым заўсёды свята. Не стала выключэннем і гэтая, калі ў юбілейныя дні мы разам з вядомым земляком-кампазітарам і музыкантам Іванам Раманчуком наведалі яго з нагоды слаўнай даты — 80-годдзя з дня нараджэння.

Нягледзячы на нашу безумоўную працавітасць, цягавітасць у буднях, усё ж занадта сціплыя, сарамлівыя мы, беларусы, на душэўнае ўзрушэнне, на захапленне. Не спяшаемся сказаць блізкаму чалавеку, творцу добрае слова, якое ніколі не бывае лішнім... Трэба навучыцца хаця б пры жыцці паспяваць дзякаваць тым людзям, хто гэтага заслужыў і хто зрабіў добрую справу для нашай краіны, а значыць, і для свайго бацькоўскага краю.

Сапраўды, паэзія Паўлава — гэта асаблівы сказ пра родны край, услаўленне працоўнай і воінскай доблесці, дабрыні і шчырасці. «Мой свет пяшчотны, мой свет суровы», — гаворыць паэт у адным са сваіх вершаў. Менавіта Любаншчына, калыска паэта, дала яму крылы ўзнёсласці і матывы паэтычных вобразаў.

Менавіта Замошша, родная сцежка вывела на шырокую «Узлётную паласу» паэтычнай творчасці простага вясковага хлапчука, якому так хацелася заглянуць, а што там за «Далягладам», убачыць, як «Сонца купаецца», як падаюць на зямлю «Светаценні», і праз прызму «Гадавога кальца» адчуць «Слязу на вейцы», паразважаць «Пад схіленым дрэвам» і адчуць прахалоду гаючай сцюдзёнай вады з «Калодзежа ў полі». Бо, як кажуць, «Бог чуе таго, хто плача».

Радкі яго вершаў — даверлівa простыя, шчырыя і празрыстыя. У іх, як у бяздонным калодзежы, дна не дастаць: за прастатой адчуваецца сапраўдне майстэрства, глыбіня балючага перажывання.

Ці хопіць жыцця наталіцца
Бяскрайнасцю поля і неба,
Скарынкаю цёплага хлеба,
Вадой, што з крыніцы бруіцца.

Што значыць для Паўлава роднае, зямляцкае, сам ён акрэсліў вось так: «І толькі маці і зямля, перасыпаная яе рукамі, працэджаная яе пальцамі, помняць і ведаюць цябе, непакояцца і чакаюць, і ты абавязаны ехаць дамоў. Там твая Радзіма. Адтуль яна пачынаецца для цябе з вялікай літары, там ты прапісаны да ўсёй зямлі».

Мы жадаем Уладзіміру Андрэевічу «здароўя, моцы, аптымізму духу і ў радасці, і ў скруху», не забывацца на свой родны кут. Уладзімір Андрэевіч не абдзелены: ён мае радзіму, жыве са сваім народам у часе, наканаваным гісторыяй.

Душа паэта ведае, да якіх крыніц прыпасці, каб прычасціцца, да якіх бяроз прыгарнуцца...

Васіль КАТКАВЕЦ.

■ Зачапіла!

БІБЛІЯТЭКА — НЕ КНІЖНЫ СКЛАД, А МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ЛЮДЗЕЙ

(Валянцін БОЙКА «Электронная «чыталка» супраць папяровай», «Звязда», 29 кастрычніка.)

Бібліятэка ці кніжны склад? Дзіўнае пытанне? А гэта як паглядзець. Асабліва сёння, калі аўтарытэт не толькі бібліятэкі, але і самой кнігі непамерна (і несправядліва) знізіўся. І таму ўсё больш настойліва гучаць галасы аб замене папяровай кнігі электроннымі носьбітамі, а звыклай бібліятэкі — электроннымі «чыталкамі».

За апошнія 20 гадоў у Беларусі знікла амаль палова бібліятэк. Не магу зразумець, каму яны сталі замінаць? Бо знікла не проста памяшканне, не кніжны склад, знікла месца для сустрэч, знікла магчымасць людзей кантактаваць між сабой, мець радасць калектыўнага бачання, дзеяння, абмеркавання.

«Нічога дзіўнага: час прымушае лічыць грошы», — заяўляе прыхільнік электроннай «чыталкі». А калі яму задаць пытанне: а чаму ён раўняе бібліятэкі з заводам, які зарабляе на сваёй прадукцыі? Гучыць адказ: «Трымаць разгалінаваную сетку «кніжняў»... становіцца немэтазгодна... Таму закрыццё або скарачэнне — адзінае магчымае выйсце з сітуацыі». Бо «матэрыяльны фактар пераважыць любыя эстэцкія дзівацтвы». Так і хочацца спытаць: якой сітуацыі? Якія дзівацтвы (аўтар палемікі зводзіць іх да «цёплага шоргату старонак і водару друкарскай фарбы»)? Што для апанента важней — скрозь, усюды і на ўсім зараблянне грошай ці выхаванне чалавека? Але ж бібліятэка не вытворчасць, а выхавальнік. Пачаўшы з адабрэння закрыцця паловы бібліятэк, аўтар катэгарычна адмаўляе ў праве на існаванне і самой кнізе. Дык жа бібліятэка і кніга — гэта дзве вялікія розніцы, як казалі некалі ў Адэсе.

І як бы хораша ні паклалі на лічбавы носьбіт томік Скарыны, Буднага ці Фёдарава, а калі трымаеш сапраўдную іх кнігу, рукі трымцяць ад дакранання да яе, шматсотгадовай. Тое ж адчуванне і ад сучаснай па-мастацку аздобленай кнігі. Бібліятэка не склад, не сховішча, дзе ціхенька спачываюць «папяровыя фетышы». Бібліятэка — месца сустрэчы людзей. Асабліва цяпер, калі не толькі ў маленечкіх вёсках, а і тых, дзе сотня, а то і больш жыхароў, няма ні магазіна, ні ФАПа, ні пошты, ні школы, ні клуба — нічога калектыўнага. А што ж рабіць жывым людзям? Суткамі сядзець па сваіх хатах і не вылазіць з «лічбы»? Дык жа далёка не ўсе сяляне сталі безагляднымі прыхільнікамі не толькі камп'ютара, але і інтэрнэту, «лічбы» — проста не навучыліся імі карыстацца. І не навучацца, бо сабрацца нават для такой вучобы няма дзе — няма адпаведнага публічнага памяшкання. Тут нават бібліёбус не выручыць, бо не пастаіш, не паразмаўляеш каля яго ні ў мароз, ні ў дождж.

Бібліёбусы цяпер ездзяць па ўсёй краіне (гэты, напрыклад, у Ашмянскім раёне). Але ці стануць яны, у плане чалавечых зносін, паўнавартаснай заменай бібліятэкам?

У дваццатыя гады мінулага стагоддзя нават у далёка-далёкіх ад цывілізацыі вёсках адкрываліся хаты-чытальні. Як падае папулярная сёння ў многіх карыстальнікаў інтэрнэту «Вікіпедыя», «хата-чытальня — цэнтр асветы ў вёсках і сёлах СССР. З'явіліся, мабыць, яшчэ ў XIX стагоддзі ў Расіі, атрымалі вялікі распаўсюд у 1920-х гадах і з'яўляліся адной з формаў лікбезу, а таксама палітычнай прапаганды. Да сярэдзіны XX стагоддзя іх былі тысячы па ўсёй краіне. З павышэннем узроўню адукаванасці насельніцтва паступова, да пачатку 1960-х гадоў, функцыі хат-чытальняў перайшлі да клубаў, дамоў культуры і бібліятэк». Значыць, «хата-чытальня» не толькі месца, дзе людзі маглі патрымаць у руках «жывую» кнігу альбо газету. Гэта магчымасць сабрацца разам — пагаварыць, сёе-тое абмеркаваць. А куды ісці сёння? На вуліцу? Пастаяць каля плота? А дзе сустрэцца са сваімі чытачамі пісьменніку? Хадзіць па хатах? Заходзіць у госці да кожнага асабіста? Але ці застанецца час кнігі пісаць.

Вось і ператвараецца «адзінае магчымае выйсце з сітуацыі» адносна «разгалінаванай сеткі «кніжняў» — іх «закрыццё або скарачэнне» — у адкрытую непавагу да людзей. Дык, можа, эканамічней «закрыць» саміх людзей, каб не хадзілі па бібліятэках, школах, поштах, каб не заміналі эканоміць грошы? А свае кнігі, што «не маюць ні гістарычнай, ні культурнай каштоўнасці», хай «выкінуць на сметнік», як зрабіў гэта Валянцін Бойка, які ў нумары газеты «Звязда» за 29 кастрычніка 2015 года надрукаваў свой погляд пад загалоўкам «Электронная «чыталка» супраць папяровай» (невядома толькі, навошта аўтар набываў тыя непатрэбныя «бескаштоўныя» кнігі, нашто грошы траціў). «Чыталка» для гарадскога аўтара, спешчанага дзясяткамі іншых магчымасцяў ладзіць сустрэчы, верагодна, і лепшая, але вось для вясковых людзей страчваецца самае галоўнае для жывога чалавека — магчымасць сустракацца з сабе падобнымі, абмяркоўваць набалелае, раіцца, спрачацца, проста пазіраць адно аднаму ў вочы. Седзячы ў сваёй хаце, гэтага не зробіш. А мы ж у большасці ўсё-такі калектыўныя істоты, мы прывыклі быць у людской чарадзе, каб разам, каб сумесна, каб размаўляць, а не маўчаць...

Занадта жорстка? Магчыма. Не, я не супраць самога аўтара. Я супраць той сітуацыі, што склалася з бібліятэкамі, супраць яе падтрымкі і папулярызацыі. Але хай гэта будзе і маім «асабістым поглядам», як і ў аўтара публікацыі. А нас хай рассудзяць людзі.

Анатоль БУТЭВІЧ,
чытач кніг і прыхільнік бібліятэк.

Извещение о проведении 07 декабря 2015 г. аукциона по продаже права на заключение договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для индивидуального жилищного строительства в Клейниковском сельском Совете Брестского района Брестской области

№ лота	Предмет аукциона	Площадь, га	Начальная стоимость, бел. руб.	Задаток (бел. руб.)	Целевое назначение земельного участка	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.)
1	Земельный участок в аг. Клейники, ул. Новая, 1А, 121281204601000802	0,1394	26 447 726	2 644 772	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	1. 10 647 230 – за изготовление документации и регистрацию участка; 2. оплата за объявления по актам выполненных работ

По улице Новой в аг. Клейники централизованно проходят сети газоснабжения и электроснабжения.

Аукцион будет проводиться 07.12.2015 в 15.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома № 364100000288 в филиале № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 200177417, код платежа 4002, задатка в размере 10% от начальной стоимости, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляются победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона по актам выполненных работ.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений **01 декабря 2015 года.**

Контактные телефоны: 93 41 35, 93 41 16.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже права аренды земельных участков для строительства объектов в городе Гродно 8 декабря 2015 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Условие продажи и целевое назначение земельного участка
1.	Право аренды земельного участка сроком на 50 лет	ул. Славинского	1,7908	440100000001008783	3 553 815 346	350 000 000	30 571 671	Строительство объекта общественного назначения (торговый объект непродовольственных товаров или строительных материалов)

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости».

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

Аукцион состоится 8 декабря 2015 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. с 9 ноября по 2 декабря 2015 года**.

Телефон для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**